# БЭРЛІБРЫ АНДРЭЯ ХАДАНОВІЧА: ТРАДЫЦЫІ І НАВАТАРСТВА

***А. У. Вінаварава***

**БДПУ (Мінск)**

***Навук. кіраўн. – І. М. Гоўзіч, канд. філалаг. навук, дац.***

**Анатацыя.** У артыкуле вызначаецца наватарства Андрэя Хадановіча ў кірунку жанравых пошукаў, даследуецца праблемна-тэматычнае напаўненне новай жанравай формы «бэрлібр».

**Ключавыя словы:** постмадэрнізм; традыцыі і наватарства; верлібр; бэрлібр; інтымная лірыка.

Развіццё сучаснай беларускай паэзіі з’яўляецца неад’емнай часткай не толькі беларускага літаратурнага працэсу, але і сусветнага, «скіроўвае» паэтаў новага «постмадэрнісцкага» кірунку да пошуку аўтарскіх жанравых форм, выкарыстання прынцыпова адрозных ад папярэдняга этапу развіцця мастацтва слова тэм «табуяванага» характару.

Наватарскі характар паэзіі Андрэя Хадановіча абумоўлены шматгранным ідэйна-тэматычным асэнсаваннем сучаснага стану беларускай інтымнай лірыкі і незвычайным падыходам да яе вырашэння. Пісьменнік стварае ўласную жанравую форму «бэрлібр», з аднаго боку, падобны на верлібр («дысеметрычны верш, у аснове рытму якога – чаргаванне вершаваных радкоў як аднатыпных інтанацыйна-сэнсавых адзінстваў» [2, с. 291]), а з другога – больш вольную і гнуткую ў тэматычных адносінах.

Дэфініцыяй новай жанравай формы стала назва зборніка «БэRлібры: гісторыя ў чатырох фільмах» (2008), змест якога складаюць вершы, напісаныя ў 2004 – 2007 гг. падчас вандровак па Берліне, Варшаве, Кракаве, Братыславе і Мінску. Для падобнага наймення А. Хадановіч выкарыстаў тэрмін, што быў прыдуманы яго сябрамі – пісьменнікамі Уладзімірам Арловым і Марыяй Мартысевіч. Зборнік складаецца з чатырох асноўных раздзелаў («фільмаў»): «Касец газонаў», «Пераключаючы каналы», «Успомніць усё» і «Апошняе мэтро».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Бэрлібры А. Хадановіча адпавядаюць законам названай вышэй формы верша (верлібр): вольная рыфма і рытмічная кампазіцыя, радкі, якія не маюць абмежавання ў памеры і даўжыні. Аднак вольнасць дастаткова ўмоўная, паэт не адмаўляе ні аднароднай сінтаксічнай канструкцыі, ні інтанацыі.

Выхад зборніка стаў працягам творчай дзейнасці паэта ў галіне куртуазнага маньерызму. «Казаць пра жанчын і каханне я магу толькі цнатлівымі пэрыфразамі» [1, с. 40], – так выказваўся А. Хадановіч задоўга да выдання кнігі паэзіі «БэRлібры». Са з’яўленнем кнігі перакананні паэта пра інтымную лірыку, што існуе ў цнатлівых перыфразах, пацярпелі няўдачу. А. Хадановіч паступова асвойвае эратычную традыцыю, вучыцца ў антычных аўтараў, фрывольных французскіх паэтаў і прадстаўнікоў срэбнага стагоддзя. Апавядаючы пра рэчы досыць далікатныя, ён нібы высмейвае як закамплексаванасць грамадства на любоўнай глебе, часта звязаную з памылковымі жыццёвымі ўстаноўкамі, так і гендарна-ролевую непаўнавартаснасць.

Пазбавіцца барацьбы са сваёй чалавечай прыродай, прайсці праз вопыт заляцанняў, паспрабаваць прыручыць упадабаную дзяўчыну, паказаць сябе ў поўным бляску як мужчына – такім становіцца лейтматыў паэзіі кахання ў прадстаўленым зборніку. Паэт іранізуе над тымі, хто гатовы душыць у сабе зварушанае моцнае пачуццё «з меркаванняў прэстыжу». Высмейваючы крывадушнасць, забабоны і табуяванасць, стаўленне да фізічнага аспекту любові як да нечага непрыстойнага, адстойвае разняволенне, паўнату і багацце інтымнай сферы жыцця, апявае асалоду і звязаны з ёй комплекс перажыванняў.

Ужо ў другім раздзеле зборніка «Пераключаючы каналы» А. Хадановіч змяшчае досыць гарэзлівы верш «Чужая мова», з пэўным уключэннем у яго элементаў эратычнасці:

*Чужая мова*
*лашчыць мне вуха,*
*як пірсінг*
*на чужым языку* [3, с. 25].

З пункта гледжання праяў постмадэрнізму, чацвёрты раздзел зборніка «Апошняе мэтро» змяшчае ў сабе найбольшую колькасць інтымных вершаў, якія спалучаюць у сабе як напружанасць вобразаў і манернасць формаў, так

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і куртуазную («узнёслую») любоў да Дамы. «Азёрная школа паэзіі» – адзін з тых вершаў, які выяўляе ў сабе ўсю, даступную аўтару, вычварнасць, што часам мяжуе з непрыстойнасцю, але ў выніку прадстаўляе сабой разгорнутую эпіграму каханню. Можна казаць і пра тое, што стылю гэтага верша ўласціва падкрэсленае штукарства. А. Хадановіч пераймае стыль англійскіх паэтаў-рамантыкаў, піша сваю гісторыю кахання з алюзіяй на своеасаблівае «стварэнне свету», дзе на шосты дзень Бог пакідае на зямлі мужчыну і жанчыну, а на сёмы:

*І было сонца на сёмы дзень.*
*І пабачыў ён,*
*што шэсьць папярэдніх было горай.*

*І былі ветразі,*
*параходы й буйкі*
*з папярэджаньнем «не заплываць».*

*І было іх двое на цэлым сьвеце,*
*калі не лічыць вадаплаўных –*
*чаек і весьляроў-акадэмістаў* [3, с. 75].

Лірыку А. Хадановіча ў большасці выпадкаў можна супрацьпаставіць закрытасці многіх паэтаў у інтымнай сферы. Напрыклад, у вершы «Оптыка» аўтар даводзіць чытачу сваю захопленасць жаночым вобразам, у якім заўсёды павінна быць гармонія таго, што ўнутры і на паверхні. У гэтым сэнсе беларускі ідэал прыгажосці не кідкі, ад яго, можа быць, не вар'яцееюць з першага погляду, але, як сцвярджае сам паэт, «гэта штосьці далікатна-таямнічае, інтрыгуючае». Мужчынам падабаецца заўважаць у жанчыне паэтыку намёку і недамоўленасці ў паводзінах і абяцаннях.

Усім вядомае выслоўе, якое абыгрываецца паэтам у адным з вершаў, «Вочы – гэта люстэрка душы». Менавіта яны могуць адлюстроўваць тыя пачуцці і эмоцыі, якія чалавек спрабуе схаваць. Тое, што вочы змяшчаюць у сабе жаночую душу, выдатна вядома мужчынам, таму яны імкнуцца гэта, бясспрэчна, выкарыстаць. Іншымі словамі, глядзець на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

жанчыну так, каб у глыбіні яе вачэй прачытаць адказы на свае пытанні, бо вочы, на думку паэта, не могуць хлусіць. І тыя ж акуляры, як і люстэрка, пакідаюць адбітак вобраза жанчыны ў думках закаханага ў яе чалавека:

*і ты трымала мяне за руку,*
*пераключаючы сны*
*і не даючы мне*
*выпадаць на паваротах.*

*а пасьля*
*перавысіла хуткасьць*
*і адчыніла дзьверку,*
*і я вываліўся*
*зь легкавіка твайго сну –*

*у адных акулярах,*
*дзе яшчэ не астыла*
*тваё апошняе*
*адлюстраваньне* [3, с. 89].

«Жанчына – гэта люстра, у якім па-новаму бачыш і адкрываеш сябе. Стасункі зь ёй – гэта тое, пасьля чаго ты не застаесься сабой ранейшым, а непазьбежна робісься сабою новым. За такія зьмены можна таксама быць толькі ўдзячным» [1, с. 40], – так распавядае паэт пра свае адносіны да жаночай прыроды.

Бэрлібры А. Хадановіча найлепшым чынам адлюстроўваюць тое, што любоўныя творы маюць свае неад'емныя атрыбуты: матывы пакуты, адзіноты, шчасця і інш.; уласцівую найперш творчасці паэта інтэртэкстуальнасць, эмацыянальнасць у перадачы настраёвасці лірычных вершаў, а таксама пэўную іронію і «гульню» паэта са словам – і ўсё гэта належным чынам падводзіць нас да вызначэння творчасці А. Хадановіча як постмадэрнісцкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адметнасць нацыянальнай інтымнай лірыкі на агульнаславянскім і еўрапейскім узроўні на прыкладзе творчасці паэта А. Хадановіча, што вызначаецца самабытнасцю беларускай інтымнай паэзіі, сцвярджае арыгінальнасць выкладу яе ў сучасным літаратурным працэсе.

## *Літаратура*


1. Курс, С.  Андрэй Хадановіч: «Пішу для адукаваных вар'ятаў» / С.  Курс // ARCHE Пачатак. – 2002. – № 3. – С.  32–41.
2. Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2001. – 384 с.
3. Хадановіч, А. Бэрлібры / А. Хадановіч. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2008. – 114 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ